УДК 338.1

У. А. Кулажанка, д-р экан. навук

# УМОВЫ І ФАКТАРЫ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

The article devoted to revealing of the external and the internal factors of modern economic growth in Belarus.

Праблема эканамічнага росту вельмі складаная, комплексная, ажыццяўляецца праз перадоленне супярэчнасцей і цяжкасцей і з гледзішча будучыні нашай краіны надзвычай важная. Усе ведаюць, што паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2005 год, зацверджаныя ўказам Прэзідэнта восенню 2004 года, выкананы ў поўным аб'ёме. На аснове істотнага росту інвестыцый (на 22,8% у параўнанні да папярэдняга года) вытворчасць ВУП павялічылася на 9,2%, прамысловай прадукцыі – на 10,4%. Сярэднямесячная зарплата вырасла на 8%. Але асобныя галіны гаспадаркі раслі не такімі высокімі тэмпамі, як чакалася. Напрыклад, аб'ём сельскагаспадарчай вытворчасці павялічыўся ўсяго на 2,1%.

Ужо распрацаваныя паказчыкі высокага сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны і на бягучы год і пяцігодку. Яны абмеркаваныя і зацверджаныя на Усебеларускім народным сходзе на пачатку сакавіка бягучага года.

Высокія тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця дасягнуты дзякуючы як узнікшым умовам (знешнім і ўнутраным), так і фактарам, якія былі выкарыстаны грамадствам і ўладамі ў ходзе ўзнаўленчага працэсу. Таму задача эканамічнай навукі ёсць сёння ў тым, каб раскрыць ролю і значэнне ўмоваў і фактараў эканамічнага росту, звярнуць увагу на рэзервы эканамічнага росту ў сёлетнім годзе і на перспектыву. Найперш звернемся да разгляду ўмоваў эканамічнага росту.

Першым штуршком да эканамічнага росту, які адносіцца да 1996 года, было скасаванне Расіяй з Беларуссю запазычанасці за энерганосьбіты памерам у 1,4 млрд. долараў. Менавіта з гэтага моманту пачаўся рэзкі рост экспарту нашай прадукцыі ў Расію. Пастаўкі прадукцыі хімічнай прамысловасці за кароткі час узраслі ў 1,64 разу (у тым ліку гумовых шын у 2,6 разу), драўніны і вырабаў з яе ў 2,33 разу, тэкстылю ў 2,0 разу і г. д.

Другім імпульсам паскарэння эканамічнага развіцця было павышэнне цэн на нафту і газ на сусветным рынку ў 2002 годзе. Расія стала атрымліваць велізарныя валютныя даходы. Увачавідкі ўзрос попыт на беларускую экспартную прадукцыю, што стымулявала развіццё вытворчасці на наяўных магутнасцях. Росту вытворчасці спрыяла тое, што Расія атрымала магчымасць субсідзіраваць беларускую эканоміку праз механізм продажу нам нафты і газу па больш нізкіх цэнах. Так, ужо ў 2005 годзе расійскія субсідыі ў беларускую эканоміку склалі праз пастаўкі нафты 1,7–2,0 млрд. дол., газу – 1,0 млрд. дол. Для нашай эканомікі адкрыліся магчымасці накаплення капіталу. Да 2002–2003 года ішоў працэс толькі пераадолення моцнага абвалу эканомікі пасля 1990 года. Аб'ём вытворчасці ВУП у 1995 годзе складаў 10,5 млрд. дол., у 2000 годзе – 11,4 млрд. дол. І пасля гэтага пачаўся бурны рост. У 2001 годзе яшчэ 12,1 млрд. дол., а ў 2002 – ужо 14,5 млрд. дол., у 2003 – 17,6 млрд. дол., у 2004 – 22,8 млрд. дол., а ў 2005 г. – звыш 25,0 млрд. дол.

З прыведзеных статыстычных дадзеных відаць, што імклівы эканамічны рост пачаўся тры гады таму – з 2003 г. і працягваўся далей у 2004 і 2005 гг. Між іншым на такі рост паўплывала яшчэ адна зноў створаная знешняя ўмова. Калі пра дзве першыя шмат пішуць і гавораць, то пра гэтую звычайна маўчаць. А беларуская эканоміка ўсё ж атрымала падтрымку і з боку краінаў ЕС. З 2004 года былі адменены пошліны на 80% тавараў, якія ўвозіліся ў краіны – новыя члены ЕС. Таксама была спынена антыдэмпінгавая палітыка на ўвоз у краіны ЕС калійных угнаенняў. Рэспубліка Беларусь стала гандляваць з краінамі Еўропы пры станоўчым гандлёвым сальда. Гэтая акалічнасць дазволіла Беларусі пакрываць значную частку адмоўнага гандлёвага балансу з Расіяй, які, нягледзячы на ўсе намаганні, не ўдавалася пераадолець.

Беларусь, скарыстоўваючы створаныя і дасягнутыя знешнія эканамічныя ўмовы, перайшла да актыўнай палітыкі эканамічнага росту. Праявілася гэта апошнім часам у тым, што стаў расці інвестыцыйны фонд. Аб якой надзейнасці і патрэбных тэмпах развіцця можна гаварыць, калі ў 1995 годзе інвестыцыі ў эканоміку ў параўнанні з 1990 годам склалі толькі 39%? Затым на працягу аж 6 год не дасягалі і паловіны ці каля яе. У 2001 годзе гэты паказчык да ўзроўню 1990 года складаў толькі 50%. А ўжо ў 2004 годзе – 66%, і толькі летась мы выйшлі альбо наблізіліся да паказчыкаў 1990 года.

Значыць, шлях да эканамічнага росту адкрыты. Доўгія гады ішла барацьба за гэта, і поспех дасягнуты. Для забеспячэння ўмоў эканамічнага росту ствараліся і ўнутраныя ўмовы.

Унутранай умовай росту грамадскай вытворчасці з'яўляецца павышэнне заработнай платы і даходаў насельніцтва. І гэта зразумела, бо, паводле вучэння Джона Кейнса, толькі рост попыту можа гарантаваць павелічэнне вытворчасці. Цяжка ўявіць сабе, што было б з нашай вытворчасцю, каб заробкі стаялі на месцы.

А вось тая акалічнасць, што сярэднямесячная заработная плата ў нашай краіне дасягнула зараз 220 дол. ЗША і прадаўжае расці, несумненна, штурхае вытворчасць наперад.

Але рост попыту на рынку тавараў як вызначальная ўмова ўздыму вытворчасці і прапановы тавараў на рынку – даволі складаная з'ява і не меней супярэчлівая. Гэта відаць з таго, што за апошнія 10 год тэмпы росту заработнай платы ў нашай краіне вышэй за тэмпы росту ВУП і ў 2 разы перавышаюць тэмпы росту прадукцыйнасці працы. Так, за 2001–2004 гады. ВУП вырас на 136%, а зарплата – на 179%. Значыць, дапускаецца адступленне ад асноўных прынцыпаў арганізацыі заработнай платы. Гэтае парушэнне трэба пераадолець. Асабліва належыць падкрэсліць, што і сённяшні ўзровень заработнай платы нельга лічыць дастатковым. Па дадзеных абследавання Мінстата, у маі 2005 года 56% працуючых атрымлівалі заработную плату ніжэй за 400 тыс. рублёў у месяц. Неапраўдана нізкай з'яўляецца зарплата працаўнікоў сельгаспрадпрыемстваў.

Узнікае пытанне, за які кошт адбылося значнае павышэнне заработнай платы ў краіне, калі апошняе апярэджвала тэмпы росту прадукцыйнасці працы і вытворчасці ВУП? Ніхто не дае адказу на гэтае пытанне. Між тым адказ ёсць. Па-першае, да пачатку даволі прыкметнага павышэння заработнай платы было дапушчана значнае адставанне заработнай платы ад дасягнутых паказчыкаў вытворчасці ВУП, як і асобных відаў вырабляемай прадукцыі. І на сённяшні дзень ўдзельная вага заработнай платы ў кошце выпускаемай прадукцыі застаецца значна меншай, чым у развітых краінах. Па-другое, Беларусь, як незалежная краіна, не плаціць болей даніну імперскаму цэнтру, гэта значыць Маскве, як было гэта раней. Як неяк адзначаў Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка, гэтая даніна дасягала 2 млрд. дол. у год, а па іншых крыніцах – да 10.

Несумненна, што праблемам арганізацыі заработнай платы ўлады павінны аддаваць шмат увагі як праблеме ўдасканалення размеркавальных адносінаў. Напрыклад, вельмі сціснутай з'яўляецца тарыфная сетка, што не стымулюе імкненне працаўнікоў павышаць кваліфікацыю. Не зусім зразумела, што ў сярэдзіне мінулага года рэзка павышана заработная плата чыноўнікам, і іх заробкі зараз у 3–4,4 разу вышэйшыя за сярэднія па краіне. Канешне, заробкі трэба павышаць усім катэгорыям працаўнікоў, але чаму трэба пачынаць з чыноўнікаў?

Далейшае эканамічная развіццё нашай краіны ў значнай меры вызначыцца тым, як будзе ствараца фонд накаплення на кожным прадпрыемстве і ці хопіць сродкаў для інвестыцый з улікам неабходнасці інавацыйнага працэсу. Напрыклад, знос актыўнай часткі АВФ складае сёння 80%. Трывожыць тое, што ў структуры таварнага экспарту доля вытворчасці з нізкай навукаёмістасцю складае 78%, сярэдняй – 18% і высокатэхналагічнай – 4%. У гэтым плане наспела праблема зніжэння падаткаабкладання. Між тым апошняе застаецца непамерна высокім. У 2004 і 2005 гг. сукупная падатковая нагрузка ў Беларусі склала 44,7% ВУП, а ў Расіі, дзе падаткі таксама высокія, аж на 10 пунктаў ніжэй – 34,1%. Што гэта азначае – зразумела без каментарыяў. Болей, чым відавочна: разам з ростам заработнай платы гэта зніжае канкурэнтаздольнасць нашых тавараў.

Улады пачынаюць разумець гэта і прымаюць меры. З мэтаю зняцця перашкодаў на шляху эканамічнага развіцця 13 студзеня 2006 года Прэзідэнт А. Лукашэнка падпісаў указ № 27 «Аб рэструктурызацыі запазычанасці і некаторых іншых мерах па фінансаваму аздараўленню стратных дзяржаўных арганізацый». Па розных даўгах устанаўліваецца неаднолькавы час адтэрміноўкі. Так, па запазычанасці па падатковых плацяжах, бюджэтных пазыках і працэнтах па іх, па плацяжах за газ, электраэнергію і цеплавую энергію, па ўплаце налічаных санкцый і налічаных пеняў адтэрміноўка прадстаўляецца на 5 год, а па пратэрмінаваных крэдытах – на 3 гады.

Фарміраванню фонду накаплення павінна служыць і ўдасаканаленне размеркавальных адносінаў праз бюджэт. Цяжка знайсці аптымальныя адносіны паміж сацыяльнай і вытворчай сферамі. І такі пошук пастаянна вядзецца. А які вынік пошуку сёння? Пакуль што незайздросны, бо 60% бюджэту ідзе на сацыяльную сферу. Ды яшчэ 10% бюджэту скіроўваецца на субсідыі АПК. Для прамысловасці і будаўніцтва застаюцца толькі крошкі. Зразумела, не можа быць і рэчы пра скарачэнне сацыяльных выдаткаў, бо ў Беларусі сацыяльна арыентаваная эканамічная сістэма. Таму дзяржава шукае выйсце ў высокіх тэмпах эканамічнага развіцця і абсалютным росце сацыяльных выплат пры адносным скарачэнні іх удзельнай вагі ў сістэме выдаткаў бюджэту.

Падтрыманне высокіх тэмпаў эканамічнага росту і забеспячэнне вырашэннння сацыяльных праблемаў грамадства немагчымае без уздыму аграрнага сектара эканомікі. Трэба адобрыць палітыку дзяржавы па аказанню сельскай гаспадарцы істотнай эканамічнай дапамогі. Перш за ўсё таму, што гэта – сусветная практыка, якая добра зарэкамендавала сябе найперш у развітых краінах. Станоўчыя наступствы такой палітыкі відаць і ў нас. Апроч гэтага, многа зроблена па стварэнню аграгарадкоў.

Аднак зрабіць у аграрным сектары трэба яшчэ шмат. Тым болей, што летась, нягледзячы на пэўныя поспехі ў развіцці раслінаводства і жывёлагадоўлі, ва ўсіх абласцях, за выклю-

чэннем Гомельскай, не забяспечана выкананне прагнозных паказчыкаў па тэмпах росту сельскагаспадарчай вытворчасці. Недабор прадукцыі раслінаводства склаў 3,8%, а ў гаспадарках насельніцтва вытворчасць скарацілася на 4,3%, што адчувальна. І гэта не выпадкова, бо колькасць рабочай сілы на вёсцы за апошнія 10 год скарацілася з 1 млн. да 400 тыс. чалавек. Калі такая тэндэнцыя захаваецца, то не будзе каму жыць у ствараемых аграгарадках, тым болей, што многія з іх збудаваны не па ўзору сядзібаў.

У 2005 годзе ў сельскагаспадарчых ды іншых арганізацыях у параўнанні з 2004 годам атрымана збожжа на 9% меней, бульбы – на 45%, гародніны – на 21%. З-за дрэннага надвор'я падчас жніва недаатрымана зерня: жыта – на 18%, ячменю – на 9%, аўса – на 22%, грэчкі – на 41%, бабовых – на 23%. Ураджайнасць зерневых у вазе пасля даапрацоўкі знізілася з 29,5 ц/га ў 2004 годзе да 27,8 ц/га ў 2005 годзе.

Як бачым, праблемаў па ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці застаецца яшчэ вельмі шмат. Справіцца з імі будзе нялёгка. Значыць, аграрная палітыка дзяржавы павінна станавіцца ўсё болей гнуткай, настойлівай і дыверсіфікаванай. У прыватнасці, нарошчванне фінансавай дапамогі калгасам і саўгасам, іншым сельскагаспадарчым арганізацыям павінна насіць усё больш прамы, непасрэдны характар. Дапамагаць калгасам і саўгасам праз пасрэднікаў становіцца ўсё болей неэфектыўнай справай. І дзяржава робіць з гэтага высновы.

Як бачым, фактараў, якія абумоўліваюць развіццё народнай гаспадаркі, стымулююць або тармозяць эканамічны ўздым, вельмі многа. І тут нельга не згадаць праблему занятасці. Паводле афіцыйнай статыстыкі, беспрацоўе ў Беларусі невялікае – 1,6%. Але па ацэнцы сацыёлагаў у Беларусі рэгіструецца толькі пятая частка незанятых. Прычына ў тым, што дапамога па беспрацоўю не стымулюе да гэтага. Яна складае толькі 17 дол. ЗША. У Польшы гэтая дапамога ў мінімальным значэнні складае 240 дол., у Літве да трох месяцаў пошуку працы – 90% сярэдняй заработнай платы, у Эстоніі – 100 доляраў. Да таго ж зарэгістраваныя беспрацоўныя, каб атрымаць мізэрную дапамогу дзесьці 37 тыс. рублёў у месяц, павінны адпрацаваць у нас на грамадскай працы некалькі дзён. Хто ж будзе спяшацца рэгістравацца беспрацоўным? Таму фактычна беспрацоўных у Беларусі 7–8%. І гэта невысокае беспрацоўе. Але яно сведчыць, што чалавечы капітал у нашай краіне не поўнасцю задзейнічаны, каб ствараць прадукт і паслугі, прасоўваць наперад эканоміку. А ў гэты час самая актыўная частка рабочай сілы пакідае краіну і едзе на заробкі ў іншыя краіны. Толькі ў Расіі працуе болей за 100 тыс. беларусаў пры афіцыйнай рэгістрацыі ды ў 2,5 разу болей нелегальна. А па ацэнцы сусветнага банка, за мяжой працуе 400 тыс. беларусаў. Праўда, яны за год прывозяць у краіну 1 млрд. дол. сваіх заробкаў, ці 5% ВУП краіны, што сілкуе эканоміку Беларусі. Але каб яны працавалі ў сваёй краіне і ў межах профілю сваёй спецыялізацыі, то стваралі б, як мінімум, удвая болей. Вось чаму задачай урада, кіруючага складу вытворчасці, усёй грамадскасці з'яўляецца мінімізацыя беспрацоўя, стварэнне новых рабочых месцаў і вяртанне на радзіму ўсіх мігрантаў-адыходнікаў, якія складаюць самую актыўную і кваліфікаваную частку рабочай сілы краіны. У сувязі з неабходнасцю дасягнення поўнай занятасці ёсць прапанова, каб з ініцыятывы муніцыпальных уладаў, ураду і выканаўчых камітэтаў малых гарадоў, раённых цэнтраў былі створаны філіялы буйных эфектыўна працуючых прадпрыемстваў. Мэта – заняць вольную рабочую сілу, а галоўнае – даць новы імпульс развіцця ўсіх рэгіёнаў краіны, забяспечыць інтэнсіўны рост эканомікі.

Нарэшце, справе развіцця эканомікі, забеспячэнню поўнай занятасці павінен служыць і прадпрымальніцкі сектар нашай гаспадаркі. Трэба сказаць, што за апошнія 2–3 гады ўлады крыху палепшылі свае адносіны да прыватнага прадпрымальніцкага сектара і апошні заўважна стабілізаваўся. Але росту не заўважана. Трэба з гэтага зрабіць пэўныя высновы, тым болей, што прыватны сектар дэманструе свае перавагі і ўстойлівасць. Так, на пачатку 2005 года ў краіне дзейнічала каля 33 тыс. малых прадпрыемстваў, дзе было занята 6% працуючых. Для краіны з 10-міль'ённым насельніцтвам гэта мізэр. Нават у Расіі, якая не характарызуецца вялікімі поспехамі ў эканамічным развіцці, малых прыватных прадпрыемстваў на 1000 чалавек насельніцтва ўдвая болей. Нягледзячы на сваю нешматлікасць, прыватны сектар па аб'ёмах вытворчасці (удзельнай вазе ў краіне) перавышае ўдзельную вагу па колькасці прадпрыемстваў і занятасці. Уражваюць сваёй перспектыўнасцю паказчыкі інвестыцыйнай дзейнасці. Па формах уласнасці ў 2004 годзе яны наступныя: інвестыцыі ў асноўны капітал у дзяржаўным сектары склалі 30,6 млн. дол. (7%), у прыватным – 341,0 млн. дол. (78,2%) і замежным – 64,5 млн. дол. (14,8%).

Без развіцця прадпрымальніцтва нельга дасягнуць высокіх тэмпаў і вялікіх аб'ёмаў вытворчасці. Так, у Злучаных Штатах Амерыкі 60% ВУП, які перавышае 8 трлн. дол. (40% сусветнай вытворчасці), выпрацоўваецца не гігантамі-манаполіямі, а дробнымі прадпрыемствамі і прадпрымальнікамі. У гэтай гіганцкай краіне кожны год пачынаюць справу 900 тыс. прадпрымальнікаў. І хоць у бізнесе застаецца дзесятая частка (90 тыс. чалавек), але штогадовы прыліў моладзі ў бізнес не спыняецца, што сілкуе бізнес даволі моцна.

Нешта падобнае трэба зрабіць і ў Беларусі. Без гэтага цяжка пераадолець непамерныя выдаткі на вытворчасць. У эканоміцы нашай краіны ёсць глыбінныя прычыны таго, што ў нашай вытворчасці затраты энергіі на адзінку ВУП у 3 разы большыя, чым у развітых краінах. Цяжка пераадолець гэты чыннік зніжэння канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў без развіцця прадпрымальніцтва.

Ментавіта з прычыны зніжэння канкурэнтаздольнасці скарачаецца таваразварот з Расіяй. У 2004–2005 гадах пачаў скарачацца як экспарт беларускіх тавараў (да 10%), так і імпарт (да 11%). На недапушчэнне такога спаду звярнуў увагу ў сваім нядаўнім інтэрв'ю Прэзідэнт А. Лукашэнка. Між тым дзякуючы прадпрымальніцтву і замежным інвестыцыям у расійскую эканоміку, у тыя прадпрыемствы, якія выцясняюць беларускія тавары, цесна стала на расійскім рынку беларускаму піву, будматэрыялам, мэблі, тэлевізарам. І калі не прыняць мер па развіццю прадпрымальніцтва і павышэнні канкурэнтаздольнасці беларускага экспарту, то праз 3–5 гадоў прадукцыя многіх вядомых у Беларусі заводаў (маторы, трактары, аўтамабілі) можа стаць такой жа неканкурэнтаздольнай, а іх прадукцыя нерэнтабельнай, як сталі беларускія станкі, матацыклы, падшыпнікі, мэбля, інтэгральныя схемы, гадзіннікі.

Як вынікае са сказанага, забеспячэнне эканамічнага росту ёсць комплексная і вельмі складаная праблема. Яе ажыццяўленне запатрабуе вялікіх сродкаў і намаганняў усяго грамадства: урада, муніцыпальных уладаў, інжынерных кадраў, міністэрстваў і ўпраўленняў, кожнага вытворчага калектыву і рабочага.

## Літаратура


1. Статистические материалы // Белорусский экономический журнал. – 2005. – № 3.
2. Статистические материалы // Белорусский экономический журнал. – 2005. – № 4.
3. Белорусы и рынок. – 2006. – № 3.
4. Белорусы и рынок. – 2006. – № 4.
5. Белорусы и рынок. – 2006. – № 5.
6. Экономический рост национальной экономики // Национальная экономика Беларуси: Учеб. пособие / Под общ. ред. В. Н. Шимова. – Минск: БГЭУ, 2005. – Гл. 3. – С. 101–184.
7. Львов Д. С. Экономика развития. – М., 2002.
8. Лукашенко А. Г. Экономическая политика белорусского государства: Лекции Президента Ркспублики Беларусь в ГГТУ, Минск, 29 ноября 2002 г. – Мн.: БГЭУ, 2002.